# Падрыхтоўка да калонаскапіі  (энтэраскапіі):

-напярэдадні даследавання прыём ежы да 10:00

-напярэдадні з 17:00 да 21:00 выпіць раствор **Фортранс** (4 пакета прэпарата развесці на 4 літра вады; выпіваць па шклянцы прыгатаванага раствору кожныя 10-15 хвілін) або **Мовіпрэп** (падрыхтоўка першага літра раствору прэпарата: неабходна змесціва аднаго сашэ А і аднаго сашэ Б цалкам растварыць у невялікай колькасці пітной негазіраванай вады хатняй тэмпературы, давесці аб'ём раствору вадой да 1 л і перамяшаць. Другі літр раствору рыхтуецца аналагічна, выкарыстоўваючы тыя сашэ А і сашэ Б, што засталіся. Пасля кожнага прынятага літра прэпарата неабходна выпіць 500 мл вады. Прыгатаваны раствор прэпарата варта выпіць з 18:00 да 21:00 па 1 шклянцы кожныя 15 хв.)

**- у дзень даследавання забаронена есці і піць;**

- прыём лекавых прэпаратаў па спадарожнай паталогіі ўзгадніць з урачом загадзя

**** Калі вы пакутуеце на запоры, неабходна мінімум за тыдзень да даследавання прымаць слабіцельнае, напрыклад, Форлакс.*

**Дыету неабходна распачаць за 5 дзён да правядзення даследавання.** Пры бясшлакавай дыеце **цалкам выключаюць з меню** прадукты, багатыя на клятчатку або якія выклікаюць закісанне ў кішэчніку, а таксама змяшчаюць семечкі / костачкі:

**1. Уся свежая гародніна, грыбы, зеляніна і карняплоды.** Адварную і перацёртую гародніну перастаюць ужываць за 3 дні да працэдуры, капуста забаронена ў любым выглядзе.

**2. Уся свежая садавіна і ягады, арэхі, семечкі.**

**3. Бабовыя: фасоля, гарох, соя і гэтак далей.** 4. Грубыя крупы: кукурузная, грэцкая, ячная, пшанічная, пярловая, карычневы рыс, аўсянка і інш. Жытні і адрубны хлеб. Белы хлеб і здобу абмяжоўваюць у меню за дзень да працэдуры. 6. Цэльнае малако і малочныя прадукты. 7. Любыя смажаныя са скарыначкай стравы. 8. Кансервы, вэнджаніна, марынады.9. Занадта вострыя і салёныя стравы. 10. Квас, піва, віно. 12. Тлустыя і жылістыя гатункі мяса, сала, каўбасы.

**Можна есці:**

Булёны: нятлустыя мясныя, рыбныя, з агародніны.

Сокі (акрамя вінаграднага і слівавага), кампоты без гушчы, кісялі, мінеральную ваду, каву, чай. Кісламалочныя прадукты, нятлусты тварог, сыр. Адварное мяса, рыбу, птушку нятлустых гатункаў. Сметанковае масла, усе харчовыя раслінныя тлушчы, маянэз.

Макаронныя вырабы з рысу і пшаніцы вышэйшага гатунку. Манную кашу. Яйкі, пажадана звараныя ўсмятку ці ў выглядзе паравога амлету. Сухое пячэнне (без фруктовых дабавак), крэкеры, здоба без кунжуту і маку, сухары з белага хлеба. Прысмакі без цвёрдых раслінных дабавак - жэле, мёд, цукар.

***!!!Для якаснага і бяспечнага правядзення любога эндаскапічнага даследавання (гастраскапіі/калонаскапіі/бронхаскапіі, пад наркозам або без наркозу) апошні прыём ежы/вадкасці павінен быць не менш чым за 8 гадзін да даследавання. Пратэрмінаваныя аналізы або адсутнасць якіх-небудзь аналізаў і абследаванняў з'яўляюцца прычынай адмовы ў планавай шпіталізацыі і прычынай адмовы ў дачы наркозу, паліпэктамія выконвацца не будзе.***